

Міхась Болсун

Паэзія

## Петрыкаў

Гамоняць сосны з ветрыкам,
Чарот ідзе ў ваду,
Дзе выплыў з лесу Петрыкаў —
Палесся дзіўны кут.
Лінейкі вуліц роўныя,
У цішу кліча парк,
Мясціны там цудоўныя
Для закаханых пар.
Пейзажы непаўторныя
Адкрыюцца з гары.
Сляды вакол гісторыі,
Ваенные пары.
Адорыць дождж вясёлкаю,
Паветра — лусту маж,
Бы зноў за Навасёлкамі
Стажок вяршыць Талаш.
Вітае Прыпяць кнігаўка,
Нырне ў траву чырок.
Вучу тут не па кнігах я
Прыроды мудры ўрок
Буслянкі па-над хатамі.
Грыбы ў лясах — бяры!
Жывуць, душой багатыя,
Палешукі-сябры.
І з мазалём, і з песняю
Адвечна тут жывуць.
Жамчужынай палескаю
Сягоння край завуць.

*2012 г.*

## «Дзеці сонца»

*Узорнай вакальнай студыі*
*Чачэрскага раённага цэнтра*
*дзіцячай творчасці «Дзеці сонца»*

Калі спяваюць «Дзеці сонца»,
праменна ззяе іх убор,
Чаруе сэрца спеў бясконца,
Імкне на волю, на прастор.
Цудоўным гукам цесна ў сценах,
Ляцяць за горад, Сож і гай…

Прымаюць гурт замежжа сцэны,
Дзе славіць ён чачэрскі край.
Дужэюць юнай песні крылы,
Звіняць, лунаюць галасы,
Бо песня — скарб духоўнай сілы,
Пяшчоты, радасці, красы.
*10.10.2012*

## Каравай на далонях

*Камбайнёрам Чачэршчыны*

Бы Чачора вясной
Разліваецца свята.
Залыты каравай
На далонях плыве.
Зноў вітае Чачэрск
Песняй звонкай, крылатай
Тых, хто з нівай дружыў,
Шчыраваў на жніве.

Шчодрасць светлай душы,
Рук руплівых упартасць
Праз гады па жыцці
Яны годна нясуць.
Клопат першы — пра хлеб, —
Легла лёсу так карта, —
Увабралі ў сябе,
Як абсягаў красу.

Хвалі спелых жытоў
Ім спяваюць адвечна.
Барва позняй зары
Там залоціць штурвал.
Не шкадуйце ж ім слоў
Цёплых, шчырых, сардэчных,
Ім, не звыклым да свят,
Не шкадуйце пахвал!
*9.10.2012*

***

Блакітныя вочы,
Лагодная ўсмешка
Прысніліся ўночы —
Чаруюць бязмежна.
Так шчыра глядзела,
Я быў, як прыкуты!
Ды сны адляцелі —
Наяве пакутвай.
*11.04.2009*

***

Сонца кроіць лёд на крыгі,
Сож згубіў зусім спакой.
Вецер чайкай лёгкакрылай
Дзень кружляе над ракой.
Вербы дружнаю сямейкай
Ногі мыюць у вадзе.
Адкрываюць лозы вейкі,
Каб вясну не праглядзець.
*14.04.2013*

## Асенні матыў

Вецер грае без смычка і нотаў.
Сум панеслі ў вырай журавулі.
Залатыя ордэны лістоты
Уручае восень зноў зямлі.
Дождж прышпіліць тыя ўзнагароды —
Зажаўцеюць сцежкі навакол,
А надыдзе волкая пагода,
Слёзы пусцяць шыбіны вакон.
Гракавым крылом блішчаць барозны —
Зябліць трактар тлустыя пласты
Покуль не абдыме вечар позні
Край туманам золкім і густым.
*17.10.2012.*